## НАТХНЕННЕ

Чаруе лета казкамі вясёлак,
І вока поўні мне міргае ўночы.
Туману сырадоем ясны золак
Пачаставаць занадта ўжо ахвочы.

Напой дзівосны прыхавай дачасна,.
О, панна-ноч, дарадчыца мая!
З'яуляецца душы радок нязгасны
Начной парой з-пад шчырага пяра.
Званочкам срэбным спеу вядзе
                                        гадзіннік
Ўслаўляе міг святога адкрыцця,
А з-пад пяра ў цішы начной гадзінай —
Чароўны сон сапраўднага жыцця.

## ПАЭТКАМ

Журбой калін,
                          святлом бяроз
Асвечана зямля мая...
Шчаслівы лёс —
                      зайздросны лес! —
Сцвярджаць сябе
                                зямлянамі
Тутэйшыя ды моцныя
Карэннямі і кронамі.
І слову маці —
                       верныя,
І дрэвам —
                сестры кроўныя.
І іншага не дадзена,
Бо прамаўляем душамі.
Агнём каліны
                  спраўджваем,
Святлом бяроз —
                абуджваем.

## КАРАБЛІ

Адкрываю сябе наноў
І здзіўляюся: столькі веры!
У магічнасць чароўных слоў,
Што ты некалі мне даверыў.

Ноч. Не спіцца. Прыбой марскі
Просіць новых радкоў да рання.
Пуцяводны маяк на гары
Зноў варожыць нам на спатканне.

Чырванее яго зара
Над Бярдзянскім салёным плёсам.
Дык лаві ж, прыручай сама
Сваю сінюю птушку лёсу.

Вось і ранак. Ці ж даплылі
Да цябе мае думкі-хвалі?
...Зноў іду сустракаць караблі,
Што вяртаюцца з сіняй далі.

* * *

Табой жыву.і дыхаю - табой!
Свет іншым стаў —
шматколерным і чыстым.
Крынічны мой душэўны неспакой
Бруіцца срэбрам, ціха і ўрачыста.

Душу вяртае зноўку з небыцця
Чароўны танец восеньскага лісця,
І даўні верш ільдзінкай пачуцця
Ужо не раніць сэрца, як калісьці.

Закрэслю ўсё. Перапішу наноў.
І ні аб чым зусім не пашкадую.
З усіх зямных і спраўджаных шляхоў
Шлях да сябе — адзіны уратуе.

Табой жыву. І дыхаю — табой!

З. Падліпская

Пралеска. — 2011. — № 3. — С. 49.